


# ДЛЯ СУЧАСНЫХ ДЗЯЦЕЙ

**У Выдавецкім доме «Звязда» (Мінск) пабачыла свет новая кніга для дзяцей. Аўтар зборніка вершаў пад назвай «Котка Вуска – беларуска» наша шаноўная зямлячка, паэтэса Людміла Кебіч.**

Змест зборніка складаюць некалькі дзясяткаў вершаваных твораў на беларускай мове для самых маленькіх: «Кніга»; «Жанчына ў космасе»; «Матуля»; «Мой прадзед»; «Родная мова»; «Дзень Перамогі» і іншых. Як відаць з назваў вершаў, новае выданне Людмілы Антонаўны Кебіч прысвячаецца самым дарагім каштоўнасцям, рэчам блізкім і зразумелым кожнаму грамадзяніну Беларусі.

У анатацыі да зборніка вершаў «Котка Вуска–беларуска» сказана: «У кнігу ўвайшлі творы, якія адлюстроўваюць мысленне, інтарэсы, развагі і захапленні сучасных дзяцей, вучаць любіць родны край, умець сябраваць, адкрываць таямніцы навакольнага свету, даражыць і берагчы родную мову. Некаторыя вершы перадаюць вясёлыя эпізоды дзіцячага, у тым ліку школьнага жыцця. Адметнасцю выдання з’яўляецца тое, што вершы напісаны не толькі з вялікай любоўю да маленькага чытача, але і з гумарам, носяць забаўляльна-пазнавальны і выхаваўчы характар. Адрасуецца дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту».

Выданне багата ілюстравана. Аўтар маляўнічых ілюстрацый да зборніка -- мастачка Алена Кандрашук. Пытайцеся новую кнігу Людмілы Кебіч, зборнік паэзіі для самых маленькіх «Котка Вуска – беларуска» ў кніжных крамах і бібліятэках. Тыраж 1000 экзэмпляраў.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

www.pisateli.by